национальных культурных традиций в тесной связи с мировым художественным процессом.

---

*1.* Из цикла СССР. «Музыка на ребрах» [Электронный ресурс] // Дневник wolfleo. – Режим доступа: http://www.liveinternet.ru/users/wolfleo/post33337857. – Дата доступа: 28.03.2017.

*2.* Из истории советской магнитофонной культуры [Электронный ресурс] // Проза.ру. – Режим доступа: http://www.proza.ru/2013/05/27/1567. – Дата доступа: 02.04.2017.

## МЕТАДАЛОГІЯ ЛІЧБАВАГА ВЫМЯРЭННЯ КУЛЬТУРЫ

***А. І. Смолік,***
*доктар культуралогіі, прафесар, загадчык кафедры культуралогіі*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

У сферы заходняй інавацыйнай гуманітарнай адукацыі хутка развіваецца метадалогія, заснаваная на стыку сучасных тэхналогій і гуманітарных ведаў, якая садзейнічае фарміраванню лічбавых гуманітарных навук. У маніфесце Лічбавых гуманітарных навук (Digital Humanities) сцвярджаецца, што лічбавыя метады даследаванняў маюць значэнне для ўсіх гуманітарных навук. Абазначаная метадалогія фактычна абапіраецца на ўсе навуковыя парадыгмы, веды і ўменні, назапашаныя кожнай з адпаведных навуковых дысцыплін, выкарыстоўваючы інструменты і перспектывы, якія адкрываюцца, дзякуючы лічбавым тэхналогіям [5].

Першапраходцамі ў гэтым кірунку былі Жан-Батыст-Мішэль і Эрэз Ліберман Эйдэн (Гарвардскі ўніверсітэт), якія стварылі праект Google Ngram Viewer, з яго дапамогай яны прааналізавалі лічбавую бібліятэку для вывучэння культурных мадэлей (частата слоў у масівах тэкстаў), даследавалі працэсы, якія адбываліся ў культуры і грамадстве. Дзякуючы праекту адначасова даследаваліся змены ў слоўніку англійскай мовы і цытуемасці імён за некалькі стагоддзяў.

У Расіі дадзеную метадалогію актыўна выкарыстоўваюць навукоўцы Вышэйшай школы эканомікі. Сумесна з калегамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гарвардскага ўніверсітэта быў створаны праект «Імёны Расіі». На яго аснове даследаваліся некаторыя цэнтральныя міфалагемы расійскай грамадскай свядомасці, высвятлялася, наколькі яны рэлевантныя, як адлюстраваны ў тэкстах і як змяняліся на працягу апошніх двух стагоддзяў. У працэсе даследавання была створана аб’ектыўная іканаграфіка, якая ілюстравала змены ва ўжыванні культурна значных для апісання расійскай рэчаіснасці эпітэтаў і вызначэнняў.

Такім чынам, на Захадзе, у Расіі складваецца інтэгратыўная навука, мэтай якой з’яўляецца выкарыстанне дакладных метадаў у вывучэнні культуры. Яе назва пакуль не вызначана. Адны лічаць яе *культураметрыяй*, іншыя ўжываюць назву *культуроміка*. Ю. М. Лотман [4] выкарыстаў паняцце *«мастацтваметрыя»* для абазначэння даследавання культуры з дапамогай колькасных метадаў.

На наш погляд, дадзенай галіне навукі найбольш адпавядае назва *квантытатыўная культуралогія* (лац. *quantitas* – колькасць), якая абазначае выкарыстанне дакладных і колькасных метадаў у вывучэнні культуры. Яна імкнецца ацаніць узровень культурных здабыткаў на аснове рэйтынгу альбо статыстыкі. Дадзеная інтэгратыўная галіна культуралогіі знаходзіцца на стыку культуры, прыкладной матэматыкі і статыстыкі.

Эфектыўнасць выкарыстання прынцыпаў квантытатыўнай культуралогіі прадэманстраваў Д. Кэрал, які сродкамі матэматычных і статыстычных метадаў дакладна вызначыў літаратурны стыль амерыканскай прозы. Для гэтага ён вылучыў суб’ектыўныя і аб’ектыўныя характарыстыкі. Першыя былі прадстаўлены ў якасці антонімаў-прыметнікаў (глыбокі – павярхоўны, вычурны – строгі, элегантны – неахайны, эмацыянальны – рацыянальны, упарадкаваны – хаатычны і інш.). Суб’ектыўныя характарыстыкі ацэньваліся пры дапамозе пэўных шкал кампетэнтнымі экспертамі ў галіне літаратуры. Аб’ектыўныя характарыстыкі ўключалі розныя лічбавыя вымярэнні, індэксы і адносіны (колькасць абзацаў, сярэднеквадратычнае адхіленне памеру сказаў, доля сказуемых дзеяння, доля пераходных сказуемых, намінальных назоўнікаў, энтрапія часу, колькасць дзеепрыметных словазлучэнняў і інш.). У выніку ўдалося выявіць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шэсць галоўных «стылявых фактараў», якія ідэнтыфікуюць узор прозы ў пэўны літаратурны стыль [5].

Аб цесным узаемадзеянні матэматыкі і культуры разважае А. В. Валошынаў [1]. Засноўваючыся на дакладных прыкладах, аўтар паказвае, як знітаваны матэматычныя прапорцыі ў каранях музыкі, выяўленчага мастацтва, архітэктуры і літаратуры. Матэматычнае асэнсаванне феноменаў прыроды і культуры выразна праступае ў залатым сячэнні, у ліках Фібаначы, законе Цыпфа.

Лічбавыя прапорцыі служаць асновай будовы музычных форм. У свой час інтуітыўна М. Багдановіч прыйшоў да разумення прынцыпу рытмічнай арганізацыі паэзіі. Ён заўзята «вылічваў музычныя рытмы і метры ў фальклоры, каб потым, падвоіўшы іх у літаратурнай плоскасці, выкарыстаць у якасці ключавога формаўтваральнага прыёму» [6, с. 80]. Паэт адшукваў у народнай паэзіі структурны, стылістычны парадак рытмічнай і гукавой арганізацыі верша, каб пазбегнуць механічнага пераносу народнай песні ў цэлым на глебу нацыянальнай паэзіі. Таму зусім невыпадкова ў вершах М. Багдановіча шмат музычнасці, заснаванай на метрарытмічнай гладкасці паэтычнай мовы.

Спробу дапасавання матэматычных метадаў да даследавання драматургічных тэкстаў зрабілі расійскія культуролагі А. Валошынаў, Ю. Дараганава [2]. Звычайна літаратурныя і тэатральныя крытыкі асноўную ўвагу звярталі на якасны змест тэксту. Яны ж паспрабавалі выявіць колькасныя характарыстыкі слова, якія, на погляд навукоўцаў, могуцьператварыць мастацкі тэкст у артэфакт культуры. Аўтары прааналізавалі чатыры драматургічныя творы: трагедыі У. Шэкспіра «Гамлет», «Рамэа і Джульета», «Атэла» і «Кароль Лір», а таксама п’есы Л. М. Талстога «Жывы труп» і М. Ф. Пагодзіна «Чалавек з ружжом».

Даследаванне паказала, што ў адносінах да вымярэння культуры магчыма выкарыстанне закона Парэта, згодна якога 20 % высілкаў даюць 80 % вынікаў, а астатнія 80% намаганняў – толькі 20% вынікаў. У адпаведнасці з тэкстам трагедыі 20% герояў прамаўляюць 80% тэксту, а астатнія 80% герояў пра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маўляюць толькі 20% тэксту. Аналагічнымі з’яўляюцца моўныя характарыстыкі і п’есы Л. М. Талстога «Жывы труп».

Для характарыстыкі герояў п’ес выкарыстоўваўся і закон расейвання Брэдфорда, які з’яўляецца тэарэтычнай асновай для ўсіх бібліяметрычных даследаванняў, а таксама яму належыць вядучая роля ў большасці інфаметрычных заканамернасцей. Статыстычны аналіз колькасці рэплік дазваляе вызначыць залежнасці, якія адлюстроўваюць характар герояў п’ес і асноўныя сюжэтныя лініі.

Такім чынам, узяўшы ў якасці адпаведных элементаў словы герояў драматургічных твораў і іх розныя камбінацыі ў выглядзе рэплік, маналогаў, дыялогаў і іншага, магчыма атрымаць шэраг статыстычных характарыстык, якія дазваляюць наблізіцца да адказаў на актуальныя пытанні: якая ўнутраная пабудова драматургічнага твора і ў чым яго сіла ўздзеяння на гледача? Якія характарыстыкі адрозніваюць творы класічнай драматургіі? Ці існуюць аб’ектыўныя крытэрыі, якія характарызуюць стыль таго альбо іншага аўтара? Ці існуе «ідэальная п’еса» з пункту гледжання танальнасці жыцця, якая адрознівае адну культурна-гістарычную эпоху ад іншай?

Парасткі квантытатыўнай культуралогіі з’явіліся і ў беларускай навуцы аб культуры. Малады культуролаг Ю. І. Кнацько ў працэсе даследавання трансфармацыйных працэсаў сучаснай айчыннай культуры спалучыла квантыфікаваныя і неквантыфікаваныя фактары. На падставе лічбавых паказчыкаў было прасочана, як на тэмп, характар, якасць трансфармацыі культуры ўплываюць прыродна-рэсурсны, экалагічны фактары [3].

На падставе вышэйадзначанага можна сцвярджаць, што колькасны і статыстычны аналіз у спалучэнні з неквантыфікаванымі метадамі з’яўляецца дзейсным інструментам атрымання аб’ектыўных якасных высноў у даследаванні розных культурных працэсаў і з’яў. Квантытатыўная культуралогія, якая толькі фарміруецца, можа прэтэндаваць на статус інтэгратыўнай навукі, мэта якой – выкарыстанне дакладных метадаў у вывучэнні матэрыяльнай і духоўнай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Волошинов, А. В.* Математика и искусство / А. В. Волошинов. – 2-е изд. – М. : Просвещение, 2000. – 400 с.

2. *Волошинов, А. В.* Характеристика трагедии У. Шекспира «Гамлет» на основе статистического анализа текста / А. В. Волошинов, Ю. С. Дараганова // Вестн. Саратов. гос. техн. ун-та. – 2012. – № 1 (63). – Вып. 1. – С. 158–165.

3. *Кнатько, Ю. И.* Факторы культурной трансформации : классификация и подходы / Ю. И. Кнатько // Вест. Полоцк. гос. ун-та. Серия E, Пед. науки. – 2014. – № 7. – С. 105–108.

4. *Лотман, Ю. М.* Искусствометрия. Методы точных наук и семиотики / Ю. М. Лотман, В. М. Петров. – Изд. 2-е, доп. – М.: Изд-во ЛКИ, 2007. – 368 с.

5. *Ромах, О. В.* Интеллектуальный потенциал культурологии / О. В. Ромах // Аналитика культурологии. – 2004. – № 1. – С. 8–11.

6. *Сакалоўская, М.* Максім Багдановіч як музычны крытык / М. Сакалоўская // Роднае слова. – 2017. – № 2. – С. 78–81.

# ИНТЕГРИРОВАННЫЕ КОММУНИКАЦИИ МЕДИАПРОСТРАНСТВА

***Т. М. Смоликова,***

*кандидат культурологии, старший научный сотрудник*
*Центра образовательных технологий НИИ теории и практики*
*управления Академии управления при Президенте Республики Беларусь*

Как правило, интегрированные коммуникации связывают с маркетингом, хотя само понятие шире и включает в себя не только передачу информации о товаре (услуге, идее, персоне, географическом месте и т. д.), но и стратегии (политики), способы, технологии, методы, модели, бизнес-процессы, в конечном итоге даже форму восприятия и передачи информации (рис. 1).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ